В очерке «Нирвана» (1913) писатель отразил свои впечатления о поездке в Кытерлез («по самому берегу моря») в 1897 году. Этот очерк представляет собой уникальное художественное единство со ***сквозными образами***: реки, солнца, степи, ветра, песни (дойны), румынского пастуха; ***смысловыми опорами***, например, мыслями о бренности всего сущего и о вечной нирване; ***характерными лейтмотивами,*** например, путешествия, дороги и жизненного пути. Отметим также, что музыкальный характер и ритм очерков Короленко связан с такой стилистической фигурой, как **повтор,** а богатство интонаций помогают выразить **риторические вопросы, восклицания, умолчания** и **антитеза**: «***Всё то же*** *море,* ***всё та же*** *синяя полоса воды,* ***всё те же****, вечно повторяющиеся и вечно изменчивые формы облаков,* ***тот же*** *ветер,* ***те же*** *колыхающиеся над ним камыши плавни… И тысячи лет пролетают над ними, и тысячи лет все так же поют и плещут волны… О чём?..*» («Нирвана»)

Современная политическая жизнь вторгается в «степную нирвану» как нечто противоестественное, инородное. Суете и пустоте общества Короленко противопоставляет величие и вечность природы: «*Не здесь ли истинное* ***блаженство****, завершение всякой философии!* ***Степная нирвана, сладкое усыпление****, во время которого снится* ***только*** *синее небо,* ***только*** *белые облака,* ***только*** *колыхание травы,* ***только*** *клекот орла,* ***только*** *веяние ветра,* ***только*** *смена дней и ночей,* ***только*** *зной и грозы,* ***только*** *дыхание вечно могучей, вечно живой и всесильной, никогда неразмышляющей природы…»* Выделим контекстуальные синонимы с лексемой «сон». Она осмысливаются писателем амбивалентно: суетные торжества в Констанце и сладкое усыпление степной нирваны, в которую художник проникает во время путешествия, одинаково названы сном, с одной лишь разницей: сон общества, с точки зрения писателя, является фальшью и суетой, а природная нирвана – истиной и покоем. В этом фрагменте читателя завораживает лиризм и полифония, богатство художественной отделки и многообразие использованных приёмов, удивительная музыкальность и ритм, переданные повтором слова «только», а также с помощью однородного членения и номинативной градации.

Вышеизложенное ещё раз подтверждает известную мысль Георгия Гачева о том, что интерференция (наложение национальных образов) – затруднение мнимое. «Столкновение национальных образов мира извлекает искры, которые освещают и тот и другой, – происходит обоюдопознание» [3; 54].

## Литература


1. Бахтин, М.М. Проблемы поэтики Достоевского / М.М.Бахтин. – М.: Художественная литература, 1972. – 470 с.
2. Бунин, И. Собрание сочинений в 6-ти томах. Т.4 / И.Бунин. – М.: Художественная литература, 1988.
3. Гачев, Г. Национальные образы мира / Г.Гачев. – М.: Советский писатель, 1988. – 26 с.
4. Короленко, В.Г. Наши на Дунае // http://az.lib.ru/k/korolenko_w_g/text_0710.shtml
5. Короленко, В.Г. Нирвана // http://az.lib.ru/k/korolenko_w_g/text_0720.shtml



**Т.Ф. Сухоцкая** (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў)


## ГАСПАДАРСКАЯ ПАРАДЫГМА Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Асоба як індывідуальны суб'ект культуры інтэнсіўна ўплывае на якасць працэсаў культурнай дынамікі, фарміруе каштоўнасныя прыярытэты грамадскага жыцця. У якасці пэўнага сацыяльна-палітычнага ідэала ў беларускай культуры выступае постаць гаспадара як сімбіёз сацыяльных якасцей і духоўна-маральных дабрачыннасцей асобы – адукаванага і мудрага дзяржаўнага кіраўніка. У сучасных умовах духоўнага і эканамічнага крызісу, сітуацыі "на ростанях" паўстае неабходнасць правільнага выбару шляхоў выратавання. Вырашэнне сітуацыі патрабуе актывізацыі

Репозиторий ВГУ

сэнсатворных магчымасцей нацыі, асобы, рэалізацыі нацыянальных духоўных каштоўнасцей ў сацыяльным будаўніцтве. Рэальны патэнцыял суверэнных суб'ектаў культуратворчасці дэтэрмінаваны гаспадарскай парадыгмай, якая была вызначальнай і дзейснай на розных этапах развіцця беларускай культуры.

Галоўным культурным героем народнага эпасу і каляндарнай паэзіі з'яўляецца дбайны, адказны гаспадар, які вылучаецца пачуццём адказнасці ў яго стаўленні да зямлі і людзей. У яго вобразе спалучаюцца якасці сейбіта і воіна. "Ёсць падставы меркаваць, што гаспадар выцесніў багоў яшчэ ў часы аграрнай рэвалюцыі ў першым тысячагоддзі да новай эры. На карысць гэтага меркавання сведчаць гімны беларускага земляробчага календара" [1, с. 242]. Беларуская гаспадарская свядомасць арыентавана на тварэнне хараства, пераўтварэнне зямлі ў квітнеючую ніву. Маральным імператывам становіцца – жыць чалавекам, аздабленне рэальнага зямнога жыцця, пераўтварэнне яго ў "казку жыцця" (Якуб Колас).

Гаспадарская парадыгма вызначыла змест каштоўнасных прыярытэтаў у часы станаўлення беларускага этнасу і нацыі. На яе арыентаваліся Ф. Скарына, А. Волан, А. Алізароўскі, К. Каліноўскі. Словам "гаспадар" афіцыйна называлі кіраўніка дзяржавы ВКЛ, а княства – гаспадарствам. У рэальнай гісторыі гэтаму ўзору найбольш адпавядаў Вітаўт, вобраз якога апаэтызаваны ў паэме Міколы Гусоўскага "Песня пра зубра". У народнай культуры князь Вітаўт выступае міфалагічным персанажам, валодае рысамі дэміурга. Паданні пра Вітаўта актуалізуюць яго велізарны рост, сілу, суадносяцца з пашыраным у беларускім фальклоры матывам аб велікалюдах-волатах, якія ў час небяспекі выйдуць з гор і будуць бараніць Беларусь. Дзяржава пры кіраванні Вітаўта дасягае найвышэйшай магутнасці, што дало падставы ўслед за сучаснікамі назваць эпоху яго княжання «залатым векам». Ідэалізацыя асобы Вітаўта абумоўлена зместам гаспадарскай парадыгмы, які вызначаны ў беларускай грамадскай і філасофскай думцы ў эпоху Адраджэння. У нацыянальнай культуры асуджаецца тыранія, прыгнечанне з боку ўладара. Вялікі князь ВКЛ у гэтым ракурсе разглядаецца ў якасці гаспадара Бацькаўшчыны, першага сярод роўных, чыя ўлада заснавана на ўласным аўтарытэце, павазе, а не сіле і прымусе. "Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела", – сцвярджае Мікола Гусоўскі [2, с. 3]. Рэалізацыю гэтага прынцыпа ў сацыякультурнай практыцы пацвярджае Аўгусцін Ратундус у "Размове Паляка з Літвінам", у якім катэгарычна адмаўляе вызначэнне Вялікага Княства Літоўскага як «дзяржавы нявольнікаў», дзе адвеку панавалі прыгон і ўціск [3, с. 532]. Паводле сцвярджэння мысліцеля, беларускія падданыя заўсёды шанавалі сваіх гаспадароў, бо бачылі ў іх прыклад самаадданага служэння Айчыне. Як бачым, постаць кіраўніка-гаспадара ўключала ў сябе не толькі працэсы кіравання і панавання, але першапачаткова выцякала з тагачасных уяўленняў аб маральнасці. У "Песні пра зубра" Мікола Гусоўскі лічыць, што галоўнай асаблівасцю дзяржаўцы перад багаццем і шчасцем зямным павінна стаць багацце духоўнае. Паэт акцэнтуе ўвагу на сувязі маральных дабрачыннасцей чалавека з натуральна-прыродным асяроддзем. Гаспадарская парадыгма не пярэчыла зместу ідэалогіі літвінізму, які грунтаваўся на каштоўнасцях народнай культуры і рыцарскай годнасці.

Важнай катэгорыяй у беларускай духоўнай культуры з'яўляецца паняцце свабоды. Ідэя індывідуальнай, суб'ектыўнай свабоды ў эпоху беларускага Адраджэння ў значнай ступені абмяжоўвалася інтарэсамі агульнага дабра. На думку Сымона Буднага ("Аб ўладзе і ўсялякім урадзе") прыярытэт дзяржаўных інтарэсаў, а не ўласная карысць павінен вызначаць постаць хрысціянскага гаспадара [4, с. 211]. У гэтым ракурсе Францыск Скарына разглядае чалавека як істоту грамадскую, сцвярджае прымат агульнага дабра,



Рэпазіторый ВДУ

“паспалітага добрага”, перад індывідуальным. Толькі ў грамадстве, разважаў ён, жыццё чалавека напаўняецца сапраўдным сэнсам, таму людзі павінны навучыцца жыць грамадой. Грамадскае жыццё патрабуе ад чалавека бескарыслівага служэння “пажытку паспалітаму”, выкарыстання ўсіх сваіх здольнасцей і дараванняў у інтарэсах агульнага дабра. У прадмове да “Кнігі Эсфір” ён наступным чынам фармулюе сваё разуменне грамадскага абавязку: “Не толико бо сами народихомся на свет, но более ко службе божией и посполитого доброго” [5, с. 109]. Паводле ўяўленняў Ф. Скарыны, сутнасцю сацыяльнага вучэння апосталаў з'яўляўся пошук згоды паміж слугамі і гаспадарамі, паміж валадарамі і іх падданымі. Пытанне ўзаемаадносін паміж багатымі і беднымі мысліцель вырашаў цалкам у гуманістычным рэчышчы. Услед за апосталам Паўлам ён заклікаў багатых ніколі не крыўдзіць бедных, памятаць пра тое, што галоўнае багацце хрысціяніна – душэўная шчодрасць. З іншага боку, кожны падданы мусіць выконваць распараджэнні гаспадароў і агульнагаспадарскія законы. Такім чынам, у грамадстве будуць дасягнуты мір і парадак, што паслужыць надзейным падмуркам для росквіту і дабрабыту [3, с. 126].

Вялікі князь, гаспадар, не быў адзінаўладцам, але прызнаным аўтарытэтам, вырашальнай фігурай, канчатковай інстанцыяй. “Справа гонару хрысціянскага гаспадара – акружаць сябе мудрымі, вучонымі і вернымі людзьмі, якія б заўжды маглі дапамагчы ці падказаць штосьці ў складаных абставінах”, – сцвярджае Сымон Будны [4, с. 212]. Прыкладамі ідэальных дзеячоў Францыск Скарына лічыў канкрэтных гістарычных асоб (Саламона, Пталямея Філадэльфа, Ісуса Сірахава), паказваў значнасць іх спраў і веліч учынкаў. Асаблівай каларытнасцю вызначаецца вобраз егіпецкага цара Пталямея Філадэльфа ў “Прадмове да кнігі “Ісус Сірахаў”. Пісьменнік паказвае велізарную асветніцкую місію цара Пталямея ўзнёслымі словамі: “Цар Пталямей Філадэльф быў незвычайным міласнікам навук і мудрасці. Ён вырашыў пакінуць пра сябе вечную славу і памяць як прыхільнік кніг і навук, а не як збіральнік царскіх скарбаў, што хутка мінаюць” [5, с. 44]. Праблема гаспадара, уладара дасканала адлюстравана ў трактаце Андрэя Волана “Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя вартасці”. Як дзяржаўны дзеяч Волан з'яўляўся непахісным прыхільнікам прававой дзяржавы. Усебаковы аналіз рэчаіснасці, вывучэнне разнастайных чыннікаў грамадскага жыцця прывялі яго да цвёрдага пераканання неабходнасці прававой дзяржавы, “дзе пануюць законы, а не асобы” [6, с. 11]. У сваім трактаце мысліцель стварае ідэальны вобраз дзяржаўнага дзеяча, вызначальнымі рысамі якога павінны стаць мудрасць, дабрачыннасць, шчодрасць.

Такім чынам, паняцце “гаспадара” адлюстроўвае ўсю сукупнасць функцый і роляў, што выконвалі дзяржаўныя дзеячы Вялікага Княства Літоўскага. Асоба гаспадара цесна звязана з феноменамі дому, роднага кута, справядлівасці. Вобраз гаспадара быў для беларускага грамадства эпохі Адраджэння пэўным ідэалам, што канкрэтызаваўся ў культурнай і сацыяльна-прававой сферы.

У процівагу этычнай канцэпцыі, сфармуляванай на беларускіх землях, у еўрапейскай культуры пануючай становіцца сілавая канцэпцыя манарха, якога Эразм Ратэрдамскі ў першую чаргу абвяшчае “воінам Хрыста”. Асоба ўладара эпохі Рэнесансу тут больш секулярызаваная, чым асоба вялікага князя. Італьянскі палітычны і ваенны тэарэтык Нікола Макіявелі ў сваім трактаце “Уладар” сцвярджаў, што ўладар знаходзіцца па-за межамі дабра і зла, яго маральны светапогляд зыходзіць з установак прагматызму: “Манарх, калі ён хоча захаваць уладу, павінен набыць здольнасць адступаць ад дабра і карыстацца гэтай здольнасцю па меры неабходнасці” [7, с. 44]. У сваёй канцэпцыі асобы Н. Макіявелі даходзіць да праяў крайняга індывідуалізму, які асуджаецца ў беларускай культуры.

Репозиторий ВГУ

У эпоху Асветніцтва ідэя гаспадара ўвайшла ў этыку фізіякратаў і выявілася ў плённай дзейнасці беларускіх асветнікаў І. Храптовіча, А. Тызенгаўза і інш. Высокі ўзровень агракультуры спалучаўся з актыўнай дзейнасцю ў сферы духоўнай, мастацкай культуры. У сядзібах і маёнтках ствараюцца “культурныя ідыліі”: тэатры, балетныя трупы, бібліятэкі і г.д.

У творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча гаспадарская парадыгма паказана праз мадэфікаваныя вобразы “добрых паноў”. Свядомае “прыхарошванне” сялянства, ідэалізацыя адносін гаспадароў і падданых былі скіраваны на кансалідацыю грамадства, на панаванне згоды і міру. Перавага аддавалася эвалюцыйнаму шляху ўдасканалення грамадства.

У рэчышчы гаспадарскай парадыгмы культура нацыянальнага адраджэння ішла да ўсведамлення неабходнасці абноўленай зямлі. У “Новай зямлі” Якуба Коласа раскрываецца хараство і разнастайнасць “тутасці”, тут-быцця. Зямля эстэтызуецца, сакралізуецца. У выніку была сцверджана магчымасць адраджэння паэтычнай інтэрпрэтацыі быцця, пераадолення бездухоўнага існавання. Утапічны ідэал беларуса-селяніна ўвасабляецца ў мары пра магчымасць свабоднай працы на сваёй зямлі, у імкненні пératварыць яе ў квітнеючую ніву, у “казку жыцця”.

Разбурэнне гаспадарскай парадыгмы пачынаецца з часоў калектывізацыі, калі зямля пачала ўспрымацца бальшавіцкімі ідэолагамі толькі як важнейшы сродак вытворчасці. Руйнуюцца гаспадаркі, абясцэньваюцца сакральныя, інтымныя адносіны селяніна з зямлёй. Спробы практычнага ўвасаблення гаспадарскай парадыгмы ўвасоблены ў дзейнасці наркама земляробства Прышчэпава, які рабіў стаўку на культурныя гаспадаркі, падтрымліваў курс хутарызацыі, які не супярэчыў, не ламаў асновы народнага светапогляду. Трагічныя вынікі калектывізацыі аб’ектыўна паказаны ў творах М. Зарэцкага (“Вязьмо”), Я. Коласа (“Адшчапенец”), П. Галавача (“Спалох на загонах”), В. Быкава (“Знак бяды”, “Аблава”, “Ваўчыная яма”).

Такім чынам, гаспадарская парадыгма ў беларускай культуры была гарантам захавання культурнай прасторы. У сучасных умовах яна выступае сродкам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і механізмаў духоўнай самарэгуляцыі, пачуцця індывідуальнай годнасці і адказнасці за існуючы парадак рэчаў. Патэнцыял гаспадарскай парадыгмы можа і павінен быць рэалізаваны ў сацыяльным вопыце нацыянальнай культуры.

## Літаратура


1. Рагуля, Аляксей. “Адвечны шлях! Калі ж, калі? – Полымя, № 11-12. – Мінск,  С.238-260.
2. Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі; пер. с лац. У. Шатона. – Мінск: БГАКЦ, 1994. – 47 с.
3. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. / В. Б. Евароўскі [і інш.]; рэд. кал.: В. Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – Т. 2: «Протарэнесанс і Адраджэнне” – 840 с.
4. Старажытная беларуская літаратура (XII-XVII стст.) / Уклад, прадм., камент. І. Саверчанкі - Мінск: Кнігазбор, 2010. – 605 с.
5. Скарына, Ф. Выбр. тв. / Ф. Скарына; уклад., прадм., пер. на бел. мову І. В. Саверчанкі. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 110 с.
6. Волян А. Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе : [пераклад з лацінскай] / Андрэй Волян. - Мінск : Выдавец З. Колас, 2009. - 142 с.
7. Макиавелли, Н. Государь; Рассуждения о первой декаде Тита Ливия; О военном искусстве / Н. Макиавелли; пер. с итал. – Минск, 2009. – 84 с.




Репозиторий ВГУ